№ 6 (35) Нядзеля 27-га лютага, 1927 г. м. Вільня Год II

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адрадж... ...ная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратызм.—Ба... —Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на...
„ „ „ 3 „ 2 ...
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul.Ludwisarska 5 m 2
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

ПЕРШАЯ ЗДАБЫЧА.

Ніжэй мы друкуем заметку аб адчыненьні беларускіх урадовых настаўніцкіх курсаў у Вільні.

Сьмела можам сказаць, што гэта наша першая перамога, першая рэальная здабыча на *лёяльным* грунце.

Праўда многа прышлося палажыць высілкаў, многа была зложана „Прасьветай“ і Беларускай Нацыянальнай Радай мэмарыялаў; была шмат клопату і інтэрвэнцыяў асабістых. Але чым больш высілкаў была пакладзена, тым прыямней здабыча.

Апрача таго, што Беларускія курсы маюць калясальнае значэньне для нашага нацыянальнага руху, бо кладуць фундамэнт пад нашую нацыянальную школу, даючы нам *кваліфікаваных з дзяржаўнымі правамі* нашых беларускіх настаўнікаў, але адчыненьне гэткіх курсаў, дый яшчэ ў Вільні, мае значэньне для нас беларусаў яшчэ і іншае. Яно паказвае, што *новы курс* палітыкі Ураду Маршалка Пілсудскага да Беларусаў *ўжо распачаўся*. Праўда адкрыцьцё курсаў гэта яшчэ толькі маленечкая частка тэй праграмы, якую накрэсьліў Зьезд Заходняй Беларусі. Але безумоўна сказаўшы А, урад скажа Б, В і г. д. Праграма, якую выстаўлялі беларускія нацыянальныя групы, *леяльныя* да Дзяржавы, павінна быць выкананай і яна выкананай будзе. Дачакаўшыся нарэшце гэтак доўга чаканых курсаў мы складваць рукі і спачываць на лаўрах і ня думаем, бо перад усім ад нас самых залежыць, каб усьлед за адкрыцьцём курсаў надыйшло-бы заспакаеньне іншых нашых культурных жаданьняў і балячак, як роўным чынам праўдзеньня ў жыцьцё праграмы сацыяльнай і гаспадарчай.

Беларуская Нац. Рада ў сваей апошняй адозве да грамадзянства казала, што для таго, каб мець права трэбаваць ад Ураду рэформаў, трэба перад усім ачысьціцца ад грамадаўскай заразы. Трэба пракануць урад, што апрача Грамады—партыі, якая ня верыла ў магчымасьць ня толькі якіх небудзь рэформаў для беларусаў, але нават у самую магчымасьць супольнага спакойнага жыцьця і біла па самай Дзяржаве—у Польшчы ёсьць яшчэ іншыя партыі, за якімі таксама ідзе народ і якія да дзяржавы лёяльны і імкнуцца да агульнай польска-беларускай згоды і супольнай працы. Грамада з сваім рэвалюцыйным плянам сваю ігру прайграла. Апрача некалькі сотняў ахвяраў - сідзячых у турмах яна не здабыла для Беларускага Народу анічога. Ды і здабыць што-небудзь маленькае, як гэтыя нашыя курсы — яна не магла, бо, ступіўшы на рэвалюцыйны шлях, яна йшла на ўсё: ці ўсё выйграць і злучыцца з Савецкай Беларусьсю, ці ўсё прайграць.

А той факт, што разам з рэпрэсіямі ў бок рэвалюцыйнай Грамады і арыштамі, Урад пайшоў на рэалізацыю беларускай умяркаванай праграмы — даказвае, па першае, што Урад нарэшце зразумеў, на якім грунце расла Грамада, а па другое, што Урад паверыў у жыцьцёвасьць і сілу беларускіх нацыянальных антыграмадаўскіх групаў у Беларускім Народзе.

Вітаючы гэты першы крок Ураду Маршалка Пілсудскага, мы пэўны, што за ім прыйдзе цэлая чарга новых. З свайго-ж боку мы праконаны, што шлях рэформаў дасьць найвялікшыя карысьці для Дзяржавы. Зразумела, што першы мамэнт, пакуль да насяленьня дакоціцца гэтая санацыйная хваля, Грамада будзе з усіх сілаў старацца патухаючы рэвалюцыйны пыл штучна падтрымліваць. Па выпадках правакацыі, якія мы бачылі у Косаве і Слоніме, гдзе падбухтораныя Грамадою сяляне панясьлі ахвяры забітымі і раненымі, мы бачым—што Грамада кідаецца на гэтыя нікаму непатрэбныя авантуры. Ахвяры ў Косаве патрэбны выключна для бальшавікоў, каб можна была крычаць на увесь сьвет аб „белым тэрроры“ ў Польшчы“, але для беларускага сялянства гэтыя ахвяры — гэта новыя сьлёзы, новае *непатрэбнае* гора.

Дык з задаваленьнем прыймаючы вестку аб адчыненьні курсаў, мы чакаем ад Ураду незабаўнага залатвеньня іншых палючых балячак нашага беларускага жыцьця, а ад нашага Народу мы чакаем поўнага ачышчэньня ад бальшавіцка-грамадаўскай заразы, што *дасьць нам сілы і права* трэбаваць далейшага праўдзеньня распачатай праграмы рэформаў.

Горадзенская канфэрэнцыя Беларускай Нацыянальнай Рады.

15-га лютага г. г. адбылася ў м. Горадні канфэрэнцыя прыхільнікаў Бел Нац. Рады,

На канфэрэнцыю прыбыла 20 прадстаўнікоў ад м Горадні і ад гмінаў. Адчыніў канфэрэнцыю старшыня Бел. Нац Рады А. Паўлюкевіч. На старшыню канфэрэнцыі прысутнымі аднагалосна быў абабраны п. Адамовіч Мікалай і сэкрэтаром п. Новік. Агульна-інфармацыйны даклад зрабіў п. Паўлюкевіч. Даклады з мейсцаў адчыталі пп. Злоцкі, Савіцкі і Новік. Злоцкі абрысаваў жудаснае палажэньне беларускага настаўніцтва ў Горадзеншчыне. П Злоцкі папракнуў Бел. Нац Раду, што яна не пашырала сваю працу на Горадзеншчыне раней, бо цяперака на Горадзеншчыну напхалася іншых, чужых беларускаму народу арганізацыяў, як N. P. Ch. „Пралетарская Грамада“, „Расейскае Нар. Аб‘еднаньне“ і г. д. п. Злоцкі адмеціў антаганізм паміж насяленьнем і асаднікамі. П. Савіцкі зьвярнуў увагу, што насяленьне Індурскай, Лашанскай і Дубенскай гмінаў да гэтага часу жыве ў зямлянках і на адбудову дзерава ад Ураду не атрымала.

Сярод дакладчыкаў ад Горадні даклад п. Адамовіча каснуўся фактаў рэлігійнага ўціску, які выразіўся ў закрыцьці цэркваў у Жыдамлі, Новым Двары і інш. П. Новік у сваім дакладзе зазначыў, што ўся беларуская інтэлігэнцыя знаходзіцца на бруку, але да грамадаўцаў ня ідзе. Што сацыялізм усіх колераў зусім на беларускай вёсцы не прывіўся і што Грамада не пусьціла глыбокіх каранёў у беларускай народнай глебе, як арганізацыя комуністычная. А што Грамада ёсьць партыя комуністычная, аб — гэтым сьведчыць хаця бы той факт, што ў Горадзенскім павятовым камітэце вісіць не нацыянальны беларускі бела-чырвона-белы флаг, а комуністычная чырвоная ануча. Пасьля дыскусіі ў якой прынялі ўдзел амаль ня ўсе прысутныя сябры, была прынята рэзалюцыя, якую падаем асобна.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі адбыліся выбары да Горадзенскага Акружнога Сэкрэтарыяту. Сэкрэтарыят зацьверджаны Белар. Нац. Радай у складзе: старшыня М. Адамовіч, віцэ старшыня Майсюкевіч, сэкрэтар — С. Новік і сябры Грыгор‘еў і Ксёнда.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Горадзенскай Акружной Канфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады

якая адбылася ў Горадні 15 лютага 1927 г., у складзе 20 дэлегатаў.

Вітаючы першыя пачынаньні рэформаў з боку Ураду Маршалка Пілсудскага ў адносінах да беларусаў і стоячы на грунце пастановаў Зьезду Заходняй Беларусі ў Вільні 27—28 чэрвеня 1926 г. канфэрэнцыя пастанавіла:

1) Злучыць усе праўдзіва нацыянальныя беларускія сілы пад нацыянальным штандарам Беларускай Нацыянальнай Рады.

2) Дамагацца згодна зложаных дэклярацыяў, адкрыцьця беларускіх школаў.

3) Дамагацца адкрыцьця беларускіх настаўніцкіх курсаў у Вільні і ў Горадні, а роўным чынам адкрыцьця беларускай мяшанай гімназіі ў Горадні.

4) Дамагацца наданьня правоў беларускім гімназіям і каб на наступны школьны год былі прыгатаваны для беларускіх урадавых школаў адпаведныя падручнікі.

5) Прасіць а дапамозе дзеравам і грашыма для гмінаў Лашанскай, Індурскай, Дубенскай і іншых, якіх насяленьне дагэтуль жыве ў зямлянках.

6) Закамунікаваць п. Міністру Асьветы аб немагчымасьці для насяленьня цалком выявіць сваю волю ў сучасных варунках складаньня дэклярацыяў на беларускія школы і прасіць аб прадаўжэньні тэрміну складаньня да трох месяцаў.

7) Дамагацца новых выбараў да самаурадаў.

8) Дамагацца дапушчэньня беларусаў на пасады ў самаўрадах і адміністрацыі.

9) Прасіць Т-ва „Беларускую Хатку“ ў Вільні аб падтрыманьні матэрыяльным Беларускага прытулку ў Горадні.

10) Канстатуючы, што „Селянска Работніцкая Грамада“ здрадзіла нацыянальныя інтарэсы беларускага народу і высунула на першы плян інтарэс гарадзкога пралетарыяту, а не сялянства; што праз фінансавую залежнасьць яна цалком апанавана праз рожных тайных комуністычных агэнтаў і мусіць падпарадкавацца распараджэньням Менска — вясьці рашучую барацьбу з гурткамі і з уплывамі Грамады, а роўным чынам і з блізкімі ей арганізацыямі, як N. P. Ch. і інш.

11) Лічыць арганізацыю „Расейскае Народнае Аб‘еднаньне“ чужой і шкадлівай для беларускага Народу, як па праграме так і па тактыцы.

12) Пратэставаць проціў закрыцьця цэркваў і прасіць Урад аб адчыненьні перад гэтым зачыненых цэркваў у Жыдамлі, Новым Двары і іншых мейсцах.

13) Пратэставаць проціў спробаў заняцьця памешканьня беларускае школы ў Горадні пад школу польскую.

14) Пратэставаць проціў спробаў новага асадніцтва пры новай парцэляцыі.

15) Імкнуцца да польска - беларускага паразуменьня на краевым грунце.

16) Вызначыць ад канфэрэнцыі аднаго прадстаўніка з мэтай зложэньня вышэй пададзеных пастулятаў Ураду.

Палітычны агляд.

Усім вядома, што сацыялісты, гэта тыя-ж самыя бальшавікі, толькі адрожніваюцца ад іх сваею тактыкаю. Як у тых, гэтак сама і ў другіх адна супольная мэта сусьветная рэвалюцыя і адно эвангельле „капітал“ Карла Маркса. Дзеля гэтага як не перасьледуюць бальшавікі ў сябе “сацыял—здраднікаў“, апошнія маюць большыя сымпатыі да сваіх крэўных па ідэі „таварышаў“ комуністаў, чым „крывапійцаў“ буржуяў Гэта яскрава выяўляецца кожны раз, як толькі пачынаецца рашучая барацьба між бальшавікамі і антыбальшавікамі. У такіх выпадках „сацыял-здраднікі“ зусім выразна выступаюць у абароне комуністаў. Гэтак было ў часе ўнутранай вайны ў Расеі, калі сацыял рэвалюцыянэры агідна прадалі разам з чэшскімі легіёнамі Калчака бальшавікам; гэтак было ў 1920 г., калі бальшавікі йшлі на Варшаву, а англійскія, бэльгійскія і нямецкія сацыялісты не хацелі прапусьціць ваеннага матэрыялу да Польшчы; і гэта самае мы бачым цяпер, калі на нашых вачах ідзе рашучая барацьба між бальшавікамі і вялікімі дзяржамі на чале з Англіяй на тэрыторыі Кітая. Мы маем на ўвазе маніфэст II Амстэрдамскага інтэрнацыянала (сацыялісты) да ўсіх сваіх сябраў.

На гэтых днях сацыялістычны інтэрнацыянал выдаў маніфэст да работнікаў і сацыялістаў усіх краёў, у якім, намаляваў даволі верны абраз сучаснага палітычнага палажэньня ў Амэрыцы, Эўропе і Азіі; заклікае сваіх сябраў да рашучай барацьбы проці сусьветнага імпэрыялізма і фашызма, пагражаючага агульнаму спакою. Выражаючыся бальшавіцкай мовай, сацыялісты аб‘яўляюць вайну вайне. Яны прадбачаць, што Амэрыка, Эўропа і Азія знаходзяцца напярэдадні вайны. Амэрыканскі капіталізм, яшчэ нядаўна абвясьціўшы лёзунг самаставуленьня народаў, у пагоні за нафтай, хоча задушыць работніцка-сялянскую Мэксыку. Арганізуючы паўстанскія рухі проці мэксыканскага ўраду, умешываючыся аднавачасна з аружжам у руках у хатнія справы рэспублік Сярэдняй Амэрыкі.

Вялікія дзяржавы на чале з Англіяй высылаюць ваенныя караблі і войска да Кітая. Міжнародныя капіталісты падтрымліваюць контр-рэвалюцыйных гэнэралаў у Кітае. „Сілы рэакцыі хочуць скарыстаць кітайскую рэвалюцыю, як прычыну для разрыва дыплёматычных адносінаў з Радавай Расеяй“. З кітайскай хатняй вайны могуць паўстаць выпадкі безпасрэдна пагражаючыя сусьветнаму спакою.

Але і ў Эўропе пагражае новая небясьпека спакою. Італьянскі фашызм, задушыўшы сваю дэмакратыю шляхам тэррора,

Мэтады палітычнай працы п. пасла Рагулі.

У сваім часе пасол Рагуля дапусьціўся з трыбуны соймавай гнюснай *ілжы* ў адносінах да Беларускай Нац. Рады. Гэтая ілжа пасла публічна была старшынёю Рады ў „Кур‘еры Віленскім“ зьбіта і *паслу ў вочы* была кінута *абраза ў ілжы*. Аднак жа відаць у пана пасла паняцьце аб чэсьці і пасольскім гонару больш як прымітыўнае і ён абразу... праглынуў. За тое адгукнуўся трохі інакш і здаецца з пасольскім гонарам зноў не зусім згодна. Надоевячы пад уплывам Бел. Нац. Рады, у Баранавічах распаўся павятовы камітэт Грамады. Скарбнік камітэту п. Плаўсюк пакаяўся і прыслаў у Раду просьбу даць магчымасьць вывясьці з грамадаўскай заразы іншых абдураных сялян, просячы адначасова прыняць яго сябрам „Прасьветы“. Урад „Прасьветы“ просьбу споўніў і ў Баранавічах быў заложаны гурток „Прасьветы і адчынена чытальня. П. Плаўсюк прасіў адночасова даць яму магчымасьць вясьці барацьбу з Грамадою па вёсках, каб уратаваць б. сваіх сябраў ад бяды. Бел. Нац. Рада, стоячы на тым грунце, што ўсіх шчыра пакаяўшыхся грамадаўцаў трэба ратаваць і скіраваць на здаровую нацыянальную дарогу, выдала п. Плаўсюку пасьведчаньне за № 101 як інструктару ад Рады ў Баранавіцкім павеце. Гэтае пасьведчаньне ашуканчым, жульніцкім і правакатарскім спосабам абяцаючы неякую там пасаду у агэнцыі Усходняй, выманіў у п. Плаўсюка, як аб гэтым апошні заявіў пісьменна, вядомы агэнт Цяўлоўскі, заманіўшы Плаўсюка да сябе ў дом і напаіўшы яго. Ад няпрытомнага Плаўсюка пад прымусам адабралі яшчэ нейкія дакумэнты і прымусілі падпісаць нейкія паперкі. Раніцою на другі дзень Плаўсюк паляцеў прасіць Цяўлоўскага зьвярнуць яму дакумэнты. Той ня толькі не аддаў, а сказаў, што ён цяпер зачыніць нам Раду. А замест Цяўлоўскага ўвечары зьявіўся да Плаўсюка ўжо пасол Рагуля, які спачатку павёў гутарку аб Інстытуце Гаспадаркі і Культуры, ў які перад гэтым прапанаваў Плаўсюку запісацца і прывёз нават кніжак, а калі Плаўсюк яму адмовіў, дык вынуўшы з кішані *тыя ж самыя дакумэнты*(!!) што перад гэтым у Плаўсюка забраў Цяўлоўскі і заявіў, што цяперака Плаўсюк разам з Бел Нац. Радай у яго руках!. Справа скіравана да адпаведных уладаў і пракурора. Здаецца дадаць што-небудзь да гэтага новага акту „этыкі“ пана пасла Рагулі нельга. Трэба толькі зазначыць што ўсё гэтае адбылася *праз 3 дні пасьля акружнай канфэрэнцыі Бел. Нац Рады*, якая адбылася ў Баранавічах і гэтак напалохала ўсіх збанкрутаваўшых палітыкаў, якія, як відаць, не страцілі яшчэ надзеі на новы пасольскі мандат, і.. на новыя 15 дзесяцінак зямліцы, якія з „пасольскай пэнсіі“ купіў сабе пасол Рагуля!..

хоча апраўдаць унутраны прымус вонкавымі здабычамі. З Албаніі зрабіў сваю калёнію. Прабуе аб'еднаць пад сваім кіраўніцтвам Вэнгрыю, Румынію і Баўгарыю. Гэты хаўрус італьянскіх фашыстаў, румынскіх баяраў і вэнгерскіх магнатаў карыстаючыся апекай лёнданскіх і ньюёркскіх банкаў, скіраваны проці Юга-Славіі, якая нэрвова гатовіцца да абароны. Карыстаючыся апекай англійскага кансэрватыўнага ўраду, італьянскага фашызму, вэнгерская рэакцыя зьнішчыла ўсе дэмакратычныя сілы свайго краю, абышла прадпісаньні трыянонскага трактату аб'разбраеньні і цяпер гатовіцца пасадзіць на трон Габсбурга. Паварот Габсбургаў аддаў бы вэнгерскія штыкі на ўслугі манархічнай контр-рэвалюцыі суседніх рэспублік. На Балканах складаецца гэтакая самая сытуацыя, як у 1914 г. перад агульна-эўрапэйскай вайною. Эпідэмія фашызма разьліваецца па Эўропе. Літоўскія падзеі выразна паказуюць на ўсю небясьпеку. Небясьпека, пагражаючая малым дзяржавам, знаходзячымся між Нямеччынай і Расеяй, павялічваецца няўдачай перагавораў аб гандлёвым трактаце між Польшчай і Нямеччынай. І ў гэтай часьці Эўропы расьце пагроза для спакою і вольнасьці.

Так акрэсьляе агульную палітычную сытуацыю маніфэст, бачачы прычыны яе толькі ў італьянскім фашызме і англа-саксонскім імпэрыялізме. Але на жаль на бачым тут ніякіх указаньняў ні на бальшавікоў, ні на іх хаўрусьнікаў немцаў. Наадварот, Радавая Расея прадстаўлена як ахвяра англійскага імпэрыялізма.

Цяпер спрабуем разьвянчаць гэтых ілжэ-прарокаў спакою „бескарысна" бароняачых кітайскі пралетарыят, Мэксыку, немцаў і бальшавікоў. Праўда, што фашызм паважна пагражае эўрапэйскаму спакою. Але хто вінаваты ў тым, што Італія, Вэнгрыя, Нямеччына, Літва і Англія апынуліся пад уладай фашызма ці нацыянал-кансэрватызма? Ці не самі бальшавікі і сацыялісты былі беспасрэдным поводам узмацненьня нацыяналізму ў Эўропе? Фашызм у Вэнгрыі прыйшоў на зьмену комунізму, як працівадзіе. Гэтак сама і ў Італіі. Літоўскі фашыстоўскі пераварот папярэдзіў толькі комуністычны пераварот, які гатовіўся маскоўскімі рукамі. І гэтага ня бачыў другі інтэрнацыянал. Англійскія кансэрватары атрымалі найбольшую перамогу на апошніх выбарах да парляманту толькі дзякуючы кароткаму панаваньню сацыялістычнага ўраду Макдональда, які пад-гатаўляў шлях да ўраду для комуністаў. У Францыі сацыялісты толькі часткова маюць уплыў на ўрад і дзеля гэтага там дайшло да частковай перамогі нацыяналізму на чале з Пуанкарэ, без якога радыкал-сацыялісты, фліртуючыя з бальшавікамі, не маглі апанаваць фінансавага крызісу.


Праўда, што Англія маніцца аб'яднаць усе нацыянал-фашыстаўскія дзяржавы Эўропы, як больш здольныя для барацьбы з бальшавізмам, які да гэтай пары не адрокся ад мэты сусьветнай рэвалюцыі. Гэта мэта была пастаўлена ў аснову Лёкарно, якое не апраўдала накладаных на яго надзеяў дзякуючы сабатажу немцаў, гуляючых на два фронты. І калі-б не фашызм ці нацыянал-кансэрватызм, дык усей Эўропе пагражала бы небясьпека чырвонай рэвалюцыі. Лепей фашызм, які дае магчымасьць вольнага жыцьця тым, хто не працуе на карысьць чырвонай рэвалюцыі, чым бальшавізм, які нікому і нічаму не пазваляе жыць.

Сацыялісты бачаць прыгнечаньне работнікаў і дэмакратыі ў Вэнгрыі, Італіі і Літве, а ня бачылі чырвонага тэррора ў той жа Вэнгрыі пры комуністычным ўрадзе Бэла-Куна, у 1919 г. Ня бачаць „бальшавіцкага раю" ў Расеі з яго чрэзвычайкамі, сьценкамі, тэррорам, перасьледаваньнем царквы, рэлігіі і інтэлігэнцыі, сялян, работнікаў і нават саміх прыхвасьняў-сацыялістаў. Што маскоўскія чырвоныя каты зрабілі з грузінскай сацыялістычнай рэспублікай і грузінскімі сацыял-меншавікамі. Кім папаўняюцца цяпер Салоўкі і сыбірская катарга, як не работнікамі і сацыялістамі пасьля таго, як ужо аканчальна аказалася зломленай расейская буржуазія і інтэлігэнцыя? Калі сацыялісты хочуць зьнішчыць фашызм, дык няхай пачынаюць гэта з зьнішчэньня комунізма. Калі яны праклямуюць вайну вайне, дык няхай пачынаюць гэта з вайны проці чырвонай сацыялістычнай Масквы, якая бачыць у вайне сродак да сусьветнай рэвалюцыі. З гэтай мэтай яна падпальвае кітайцаў проці чужаземцаў, галоўным чынам проці Англіі, якая мае найбольшыя канцэсіі на палудні Кітая, каб выклікаць аружную інтэрвэнцыю вялікіх дзяржаваў у Кітае і выкарыстаць гэта для сваіх рэвалюцыйных мэтаў. Ці-ж ня ясная правакацыйная роля чырвонай Масквы у кітайскім канфлікце?

А нарэшце хто больш выразна гатовіцца да вайны, як не самі маскоўскія чырвоныя дыктатары пры дапамозе нямецкіх нацыяналістаў, аб якіх амстэрдамскі інтэрнацыянал не ўспамінае зусім у сваім маніфэсьце да працоўнага люду сьвета? Гэтым сваім выступленьнем II інтэрнацыянал толькі лішні раз расьпісаўся у сваей шкадлівай рабоце на карысьць бальшавізма і запраўднай пагрозы агульнаму спакою. Лепей мець дачыненьне з адкрытым ворагам — бальшавікамі чым такімі прыхільнікамі спакою і вольнасьці, як сацыялісты.

N.

Адчыненьне парляманту у Індыі.



Яшчэ нядаўна індусы былі рабамі англійцаў. Сяньня яны дабіліся свайго парляманту.
На фатаграфіі ўрачыстае адкрыцьце парляманту.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ВЫДАЧА САВЕЦКАГА АЭРАПЛЯНУ. Польская ўлада зьвярнула савецкай вайсковай уладзе аэраплян, на якім уцяклі з Кіева да Польшчы савецкія вайсковыя лятуны Клім і Тімошчук. Для атрыманьня аэрапляну да Польшчы прыбылі з Менску камісары, якія і ўляцелі на гэтым аэрапляне да Расеі. Лятуны Клім і Тімошчук засталіся ў Польшчы, як эмігранты.

ПАДАРОЖА ПОЛЬСКІХ ПАСЛОЎ ДА ФРАНЦЫІ. Выехала да Францыі польская парлямэнтарная дэлегацыя. У склад дэлегацыі ўваходзіць 20 паслоў і сэнатараў ад розных партый. Па дарозе дэлегацыя заедзе да Прагі чэскай.

ПОЛЬСКА - ЛАТВІЙСКІ ГАНДЛЕВЫ ДАГАВОР. Польскі пасол Лукасевіч зложыў у Латвійскім міністэрстве замежных справаў праэкт гандлёвага трактату паміж Польшчай і Латвіяй.

НАРАДЫ ПРАВАСЛАЎНАГА СЫНОДУ. 23 лютага распачалася ў Варшаве сэсія сьв. сыноду праваслаўнае царквы ў Польшчы. У сэсіі прымаюць удзел усе праваслаўныя епіскапы ў Польшчы.

СПРАВА ПАСЛА ВАЯВОДЗКАГА. Маршалкоўскі суд скончыў разгляд справы пасла — правакатара прыяцеля Грамады Ваяводзкага.

На гэтых днях чакаецца прыгавар.

КАТАСТРОФА З АЭРАПЛЯНАМІ. 24 лютага ў часе лёту стукнуліся два вайсковыя самалёты 4 палка. Апараты ўпалі на зямлю і зусім зьнішчыліся. Адзін з лятуноў згінуў на месцы, другі цяжка ранены.

За граніцай.

ПАДЗЕІ Ў КІТАІ. Чырвоная кантонская армія, разьбіўшы армію гэн. Фана падыйшла да самага Шанхаю — апошняй англійскай пляцоўкі ў Кітаі. Прадмесьці Шанхаю ўжо былі абстрэляны кантонскай артылерыяй. Шанхайскія бальшавікі абвесьцілі забастоўку, каб дапамагчы кантонцам; усяго забаставала 250,000 чалавек. З забастоўкай распачалася вострая барацьба, — злоўленых агітатараў на месцы казьняць. Да гэтага чусу казьнена 1200 агітатараў.

Ангельскае войска заняло важнейшыя пункты Шанхаю.

Аднак упадку горада можна чакаць кожную мінуту.

ПАЛІТЫЧНЫЯ КАНФЭРЭНЦЫІ Ў КОЎНІ. З Коўні паведамляюць, што на гэтых днях туды маюць прыехаць англійскі і амэрыканскі паслы. Тэмай гутарак мае быць зьмена польска-літоўскіх адносінаў

НІШЧЭНЬНЕ ФАРТОЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ. Ваеннае Міністэрства Нямеччыны выдала загад камэндантам паасобных усходніх фартоў зьнішчыць украпленьні, аб якіх гаварылася на парыжскай канфэрэнцыі. Вызначаны тэрміны зьнішчэньня паасобных фартоў.

ЧЭХАСЛАВАКІЯ НЕ ПРЫЗНАЕ С. С. Р. Р. У апошнія часы шмат гаварылася аб тым, што чэхаславацкі ўрад мае прызнаць С.С.Р.Р. de jure. Аднак урад выдаў камунікат, ў якім катэгарычна пярэчыць гэтым весткам.

РЭЛІГІЙНАЯ БАРАЦЬБА Ў ІНДЫІ. У Бамбаі дайшло да аружнае бойкі паміж мусульманамі і сябрамі індуске сэкты Сікхс. Умяшалася паліцыя, якая ўжыла аружжа. Забіта 23 асобы і шмат ранена.

СЬМЕРЦЬ ПІСЬМЕНЬНІКА БРАНДЭСА. Памёр маючы 85 гадоў, вядомы датчанскі пісьменьнік Брандэс.

КАБІНЭТНЫ КРЫЗІС Ў ЭСТОНІІ. Кабінэт падаўся ў адстаўку з прычыны выніку галасаваньня ў парлямэнце, які большасьцю галасоў сцьвердзіў, што распараджэньні міністра ўнутраных справаў у справе комунальных выбараў — спрэчныя з выбарнай тактыкай.

АПЕКА ЗЛУЧ. ШТАТАЎ НАД НІКАРАГУА. На моцы ўмовы праектаванай кансэрватыўным урадам, які знаходзіцца пад уплывам Зл. Штатаў, Злучаныя Штаты абвесьцілі, што ў працягу 100 гадоў будуць апекавацца Нікарагуа, запэўняючы ёй сувэрэннасьць і незалежнасьць.

Гэты акт выкліканы тым, што варожае Зл. Штатам, а падтрымліванае Мэксыкай лібэральнае войска амаль зусім было перамагло кансэрватараў, а абвесьціўшы сваю апеку Зл. Штаты спынілі ў Нікарагуа хатнюю вайну і такім чынам утрымаўся стары кансэрватыўны ўрад.

ПАДАРОЖА МУССАЛІНІ. У гутарцы з супрацоўнікам „Чыкага Трыбун" галава італьянскіх фашыстаў Муссаліні заявіў, што вясной г. г. ён прадпрыме падарожу па Эўропе, прычым сярод лета між іншым, будзе ў Прыбалтыцкіх дзяржавах і Польшчы.

Рэарганізацыя Інстытуту Дасьледу Нацыянальных Пытаньняў у Польшчы.

Нядаўна рэарганізаваны Інстытут Дасьледу Нацыянальных Пытаньняў у Польшчы.

Урад інстытуту, на чале з паслом Тугутам, падзеляны на тры сэкцыі: міжнародную, нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, і нацыянальных меншасьцяў у іншых дзяржавах. На чале першай сэкцыі знаходзіцца праф. Гандэльман. На чале другой пасол Гугут.

Заданьнем інстытуту зьяўляецца навуковы дасьлед праблем з галін сацыяльнага, культурнага і палітычнага жыцьця меншасьцяў у Польшчы і заграніцай, а такжа састаўленьне навуковага архіва.

Урад інстытута, на чале якога да апошняга часу знаходзіўся пасол Голубко, стварыў тры камісіі: украінскую, беларускую і жыдоўскую. Арганізацыя сэкцый іншых нацыянальных меншасьцяў прадбачыцца ў найбліжэйшым часе.

У склад кожнай камісіі ўваходзяць сябры інстытута, а такжа прадстаўнікі навуковых колаў данае меншасьці.

КАМУНІКАТ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ РАДЫ.

Да Беларускай Нацыянальнай Рады ўсьцяж паступаюць запытаньні ад расчараваўшыхся грамадаўцаў, якім чынам можна выступіць з Грамады.

Дзеля гэтага Б. Н. Рада прапануе па ўсім справам, у тым ліку і як выйсьці з Грамады, зварачывацца да Сэкрэтарыятаў Рады на мясцох.

Многія сяляне б. грамадаўцы, паляць масамі свае сяброўскія чырвоныя білеты, думаючы, што гэткім спосабам яны зрываюць з Грамадою.

Радзім усім жадаючым аканчальна і фактычна разарваць з Грамадой і гэткім чынам забясьпечыць сябе ад рожных няпрыемнасьцяў — ня дзёрці і не паліць білетаў, а зварачываць іх да Сэкрэтарыятаў Рады з просьбамі аб перасланьні да газэты, або прысылаць проста у рэдакцыю нашае газэты.

Беларуская Нацыянальная Рада.

Галена Ромэр.

ЯШЧАР! ЯШЧАР!

(апавяданьне з беларускага народнага жыцьця).

Вецер спыніўся. Паветра перастала рухацца. Высокія, чорныя дрэвы, што павырасталі дзе-недзе паміж хатаў, распрасталі свае галіны аж да найтанчэйшых валокнаў і кружаўной сеткай пакладзіся на імглістай сяйве неба.

Ува ўсім прасторы ўсё ажно скрыпела ад марозу. Бо ён-жа гэта самы і йшоў ласьне лесам—цёмным борам, полем — белым цалунам, спушчаўся глыбокім шляхам паміж гурбаў сьнегу да вёскі і йшоў паміж загародак, сьцiсківаючы жордачкі сталёвымі пальцамі. Жменяй сваей хапаў ён за грудзі праходзючых міма, ўкручаных ў рудыя кажухі, людзёў і дабіраўся ім да сэрцаў, да лёгкіх, да горла, ажно выпіраючы з іх дых, які выходзіў спруцянелымі пасмамі пары з іхніх вуснаў. прымушаў іх няхоцькі да слоў, поўных зьдзіўленьня і пашаны для ягонай магутнасьці: „Ух і мароз жа-ж, мароз!!!

А ён ішоў сабе, бадзяючыся каля зрубаў хат, зьмяняючы паветра ў нейкае калючае, вострае шкліва, якое бы йголкамі пранізывала кожную жывіну, абязсіліваў і усыпляў птушак і, выкалупаўшы іх са сковаў, скідаў мёртвымі на сьнег, на якім ляжалі яны, бы цьвёрдыя, халодныя кулькі пёраў, гэтак яшчэ нядаўна поўныя цяпла і жыцьця.

Сабакі прасіліся ў хаты, калі-ж іх стуль выганялі, дык туляліся ў будках, або залазілі ў хлявы, прысядаючы на момант у садох, каб зацягнуць тамака карэткую, жальлівую песьню роспачы, лямант над выходзячым адусюль, заміраючым жыцьцём. А калі яны скугалілі гэтак енкліва і трывожна, далёка, глуха, недзесь ў лясох адказывалі ім іхнія пабратымцы і ворагі, шэрыя, вялізныя ваўкі, у гэткія ночы падыходзячыя да вёсак, паўзучай хадой, каб падкапацца пад хлявы і сьцягнуць у гушчар кабана ці авечку.

Сонейка стаяла спруцянеўшы на бледа-ліловым небе, крывава чырвонае, бы тое сэрца выдзёртае мукай з грудзёў чалавецкіх. На поў неба разьліло яно струйкі яснай пурпуры і ўраз стрэлілі з іх залатыя бліскі, сыпнуліся на сьнег мігцячыя сафіры, тапазы брылянты. Гэтак аддаючы струпехлай ад холаду зямлі ўсі сваі багацтвы, уміраючае ад жалю сонейка чароўна хварбавала прасторы.

Але мароз кінуўся і на іх сваей пасьцяй і кладучы плахты шэрай цені, зьмятаў з нябескай столі ўсі бліскі і ясноты.

Увесь сьвет пасінеў, быццам паміраў ад нейкайсь пошасьці. Зьнярухомелі, йдучыя проста ў гору, быццам ахвярныя, дымы з аблупаных вясковых комінаў. Ў глыбіні хат, як мага стульней, зачыніўшы старанліва дзьверы, прытуліліся маўчком людцы.

У поўнай цішы чуваць было толькі парою глухое стагнаньне мучаных дрэў, трэскаючых пад жалезнымі абыймамі марозу, які снаваў укруг, бы ўладар гэтых прастораў, зьніштажаючы ў камлёх іхнія неадкладныя для жыцьця сокі і дабіраючыся да самага нутра клёнаў, ліп і рабін, каб ўкусіць іх сьмяротна і здужаць.

Раптам ў гэную зсіва-сінюю мярцьвечыну, ў спруцянелае ад жудасьці паветра, ўдарылі з трэскам і скрыпам адчыненыя дзьверы аднае з хат і шыбануў, разьдзіраючы крыштал прастору, гоман, сьмех, піск і вераск маладых галасоў, закатлавалася, замітусілася паміж сіняватых валаў шклістага сьнегу. Забрахалі радасна, даверчыва, збуджаныя з драмоты сабакі. Гаiатлівыя, цягучыя, абрываныя слова цэльнае грамады хлапцоў і дзяўчат, паролі марозную даль і нясьліся няспыненыя, ўдараючы слабым рэхам ажна ў стульныя валы бароў, ажна ў плюшчы далёкіх вазёраў.

У нос, ў морду, на злосьць жартавалі яны з марозавае моцы.

„У-ух жа-ж калючы!

У-ух жа ж пякучы! Мароз-маразічок, даў-жа-ж, даў дыхту людзям! Глядзі, каб ты свайго носіку не адмаразіла Алеся!

Пашоў, адчапіся мара, што табе ад мяне... Каруська глядзі ўжо зара за лес зайшла .. пацісьне цяпер..."

„Дзяўчаты, дзяўчаты што-ж будзем стаяць, памерзнем, а то ж Каляды! Ігрышча! То-ж вам сяньня страх .. то-ж яшчар"!"

„Яшчар! Яшчар! Пойдзем! Бягом! Пасьпеем! Ух, Яшчар! баюся, ідзі! Ах, Езус! ледзь што не перакуліў у гурбу, Сыльвук ты-жа зусім дурны".

Плялося ўсё гэта і сыпалася, перабіваючы і блытаючы адно з другім, вельмі галасна, крыкліва і ўзаемна перакрыківаючыся, словам гэтак як звычайна гутараць беларусы, калі яны ў грамадзе, узбударажаныя гульнёй і гарэлкай. Іншая справа калі яны адзінотны ці удваёчку, німашака тады больш ціхага і задумлёнага народу...

І цяперака, пасьля хвілёвага выбуху пры выхадзе з гарачай бы лазьня хаты, грамада рассыпалася на дробныя часткі, злежаныя з паасобных параў або гурткоў ў некалькі асоб, і ўсе яны йшлі борзда на другі канец вёскі, сьцішна гамонячы. Дзяцюкі абыймалі дзяўчат, укутаных ў аўчыны і хусты, заглядаючы ім у вочы, прыціскаючы да сваіх іхнія зьмерзшыя, шарахаватыя рукі, схаваныя ў рукавы кажухоў, слухаючы бурклівых, няпэўных і нявыразных адказаў на пытаньні робленыя шопотам, блізка, твар пры твары.

Загневаны мароз кусаў гэну моладзь як мага, гнаўся за імі цераз глыбокія каляіны сіняга пад вечар сьнегу, зьмяняў у белы шоран вільгаць на расьніцах і разразаў бы шклом вусны, каторыя злучаліся і шукалі сябе ўзаемна сярод прытульнага цяпла йдучых параў.

Уваходзячы ў сянцы прасторнае хаты з невялічкіх вокнаў, якое біў на сьнег мігцячы бліск газавай „капцілкі", яны згрудзіліся на момант бы стада авец, пахнючае потам і воўнай. Хто ў сянях, а хто ў самай ўжо

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Польска-Нямецкі Гандаль

13 лютага былі аканчальна спынены польска-нямецкія гандлёвыя перагаворы, якія без уселякіх вынікаў цягнуліся з перарывамі каля двох гадоў. Гэткім чынам гэтак званая „мытная вайна" між Польшчай і Нямеччынай будзе цягнуцца далей. У зьвязку з гэтым цікава паглядзець, якія ж наагул гандлёвыя адносіны істнавалі між Польшчай і Нямеччынай і якую ролю гуляла апошняя ў польскім гандлёвым балянсе.

Як у нашым вывазе (экспорце), гэтак сама і ўвозе (імпорце) Нямеччына займала да гэтай пары першая мейсца. Але з абвастрэньнем „мытнай вайны" гэта залежнасьць Польскага рынку ад Нямеччыны паволі слабее не бяз узаемнай шкоды, бо самым карысным гандлям лічыцца гандаль між беспасрэднімі суседзямі. Вартасьць польскіх тавараў, вывязеных у Нямеччыну ў 1922 г., дасягае 324 мільёнаў зл., ці 49,5% агульнага нашага вывазу; у 1923 г. — 605 мільёнаў зл. (50,6%), у 1924 г. — 536 міл. зл. (42,4%), у 1925 г. — 525 міл. зл. у золаце (35%), 1926 г. — 331 міл. зл залатых (25%). Гэтак сама паволі падаў і прывоз з Нямеччыны да Польшчы. У 1922 г. было прывезена да Польшчы на 312 міл. зл., ці (37%), агульнага нашага імпорту, 1923 г. — 487 міл. зл (43,6%), 1924 г. 517 міл. зл. (34%), 1925 г. — 497 міл. зл (30%) і 1926 г. — 212 міл. зл. (22%).

Адсюль відаць, што як вываз з Польшчы да Нямеччыны, гэтак сама і ўвоз з Нямеччыны да Польшчы з кожным годам усё зьменшаўся Але ня гледзячы на гэта Нямеччына займае першае мейсца ў нашым гандлёвым балянсе, гэтак нпр., прывоз Францыі 1923 г., — дасягае 3,8% агульнага польскага імпорту, 1924 г. — 4,9 проц., Англійскі імпорт у 1923 г. — 8,1%, 1924 г. — 7,5%, італьянскі: 1923 г. — 1,9%, 1924 — 5%, бельгійскі: 1923 — 1,4%, 1924 — 2% і г.д. Гандлёвыя абароты з Рад. Расеяй зусім амаль ня уваходзяць ў рахунак Польшчы ня гледзючы на тое, што па сваей істоце польскі і расейскі рынкі адзін другі дапаўняюць. Гэтак прывоз з Расеі ў Польшчу ў 1922 г. складае 3,2% агульнага прывозу, 1923 г. — 1,9%, 1924 г. 0,2%. Вываз з Польшчы ў Расею — 1922 г. — 0,3%, 1923 г. — 0,4%, 1924 г. — 1,2 проц. Наагул у вывазе Расеі Польшча займае 15 места, а у ўвозе — 12 места. Што датычыцца удзелу польскага ўвоза і вываза ў агульным нямецкім гандлёвым балянсе, дык ён складае ад 2 проц. да 4,5 проп. агульнага нямецкага экспорту і імпорту.

Нямеччына з кожным годам вельмі павялічае свае гандлёвыя абароты. Гэтак за 8 першых месяцаў 1924 г. нямецкі экспорт складае 4,5 мільярда нямецкіх мар., 1925 г. — 6,4 мільярда мар, 1926 г. — 7,3 мільярда мар. Прыняўшы нямецкую марку роўнаю 2,12 зл. і вылічыўшы за цэлы год, атрымаем нямецкі экспорт за апошні год раўным менш — больш 21 мільярд злотых. Польскі вываз у 1926 г. дасягнуў 2,252 мільёнаў зл., увоз — 1549 мільёнаў зл., надвышка вываза над увозам — 703 мільёна. Гэткім чынам польскі экспорт прыблізна ў 10 разоў менш нямецкага. Наагул гандлёвы рух Польшчы ў параўнаньні з яе вялічынёю вельмі слабы. Влад. Грабскі, будучы яшчэ прэм'ерам і міністрам скарбу, падаў цікавыя даныя адносна вялічыні экспорту і імпорту, які прыходзіцца на аднаго жыхара ў розных краях. Імпорт: Англія — 630 зл. на аднага жыхара, Францыя — 602 зл., Нямеччына — 400 зл. Швэйцарыя — 342 зл., Італія — 273 ліры, Бэльгія — 1220 бельг. фр., Польшча — 29 зл. ў 1922 г., 38 зл. у 1923 г. Экспорт: Англія — 530 зл., Францыя — 538 зл., Швэйцарыя — 423 зл, Нямеччына — 332 зл., Італія — 322 ліры, Бэльгія — 515 фр., Польшча 1922 г. — 22,5 зл., 1923 г. — 41 зл. Агульны гандлёвы абарот Польшчы меншы, чым у Чэха-Славакіі, Аўстрыі, Даніі, Швэйцарыі інш.

У гандлёвым балянсе нават сваіх суседзяў Польшча стаіць у самым хвасьце, у той час як немцы займаюць адно з першых мейсцаў. Гэтак нямецкі ўвоз да Літвы ў 1926 г. складаў 48 проц. агульнага літоўскага ўвозу, а экспорт — 29 проц. у той час як Польшча зусім не гандлюе беспасрэдна з літоўцамі. Напрыклад у Польшчы з Італіяй існуюць найлепшыя палітычныя адносіны, а між тым ў гандлёвым балянсе апошняй Польшча зусім не уваходзіць у рахунак, у той час як немцы займаюць другое мейсца (першае Злуч. Штаты Амэрыкі) ў італьянскім імпорце (10 проц.) і трэцяе мейсца пасьля Зл. Штатаў і Францыі ў экспорце (11 проц) У увозе да Юга-Славіі Польшча займае 12 мейсца (Аўстрыя першае, а немцы 4) і увоз з Польшчы да Латвіі у першай палове 1926 г. складаў 9 працэнтаў і г. д.

Пры гэтым трэба указаць на адну асаблівасьць Польскага Гандлю У апошні час у Польшчы заметна моцная тэндэнцыя к павялічэньню вываза і зьмяншэньню ўвоза з мэтай дасягненьня актыўнага балянсу. У 1926 г. гэта надвышка дасягнула 703 мільёнаў зл. пры 1,5 мільярдным вывазе. Зусім зразумела, што гэта вельмі прыемна для сябе, але справа ў тым, што такая дзяржава прадстаўляе малую вартасьць для іншых дзяржаваў. Адным з матываў схіліўшых немцаў да перарыва гандлёвых перагавораў з Польшчай, быў як раз гэты самы, на што яны выразна указалі ў сваем афіцыяльным камунікаце. Нямецкі гандлёвы балянс увесь час пасыўны, гэта значыць, что увозіцца больш, чым вывозіцца. Экспорт Англіі ў 1926 г. дасягаў 652 мільёна фунт ст., а імпорт — 1,243 мільёна ф. ст., ці роўна ў 2 разы больш увезена, да Англіі, чым вывезена, З усіх дзяржаваў толькі ў Францыі і Чэха-Славакіі гандлёвы балянс актыўны Але ў іх гэта дасягаецца без асобных аграніченьняў, у той час як у нас дзякуючы розным увадным рэпрэсыям. Гэтакая палітыка мае шмат няпрыемных вынікаў апрача адзэй карысьці — штучнага актыўнага гандлёвага балянсу, ад якога залежыць курс злотага. Хаця ад таго, што ў Англіі, Нямеччыне, Швэйцарыі, Голяндыі і др. дзяржавах гандлёвы балянс пасыўны, валюта стаіць моцна, як мур.

S.

Біржа.

25 II. 27 г.

Даляры	8, 94 зл.
Залаты рубель	4, 73 зл.
Сярэбраны рубель	2, 81 зл.
Чырвонец	33, 95 зл.

Збожжа

(Варшава)

Жыта (100 кілагр.)	— 39 зл.
Пшаніца „ „	51 — 50 зл.
Ячмень бравяровы	— 36 зл.
Ячмень крупяны	31 — 32 зл.
Авёс „	— 31 зл.

(Віленшчына)


Жыта (100 кілагр)	41 — 42 зл.
Пшаніца „ „	50 — 51 зл.
Ячмень брав	38 — 41 зл.
Овёс „	36 — 37 зл.

Абвестка.

Сэкрэтарыят Беларускай Нацыянальнай Рады ў Дзятлаве гэтым даводзіць да агульнага ведама, што месьціцца на вул. Слонімскай, Готэль „Брыстоль" дзе і прымае інтэрэсантаў.

Сэкрэтарыят Б. Н. Р. у Дзятлаве.

Нядзельны дзень у Петраградзе.



Ня гледзячы на ўсе перасьледаваньні хрысьціянскай веры бальшавікамі, рэлігійнасьць у Савецкай Расеі ня толькі ня упала, а вырасла і ўкаранілася. Аб гэтым яскрава сьведчыць вышэй паданая фатаграфія. Гэта вядомы Ісакіеўскі Сабор у Петраградзе, з якога выходзіць пасьля службы таўпа народу.

Камунікат Т-ва „ПРАСЬВЕТА"

Кураторыум Віленскі падаў камунікат гэткага зьместу: Школьныя ўлады арганізуюць дапаўняючыя курсы для былых расейскіх народных вучыцялёў. Курсы маюць трываць год і пачнуцца з восені. Прынімаць на курсы будуць толькі мужчын, бышых ужо вучыцялямі і знаёмых з беларускай мовай.

Кандыдаты павінны падаць школьнаму інспэктару свайго павету просьбу, напісаную ўласнаручна, - кожын ад сябе. Трэба падаць пры гэтым дакумэнты: 1) мэтрыку, 2) пасьведчаньне тожсамасьці асобы з фатаграфіяй, 3) доказ польскага абыватэльства, калі гэта не адзначана ў пасьведчаньні асобы. 4) пасьведчаньне повятовага доктара аб здатнасьці да вучыцельскае прафэсіі, напісанае паводле ўрадовых узораў, 5) вучыцельскія дакуманты, якія сцьвярджаюць, што кандыдат здаў экзамены на народнага вучыцеля (ці на дамовага), або скончыў вучыцельскую сэмінарыю, ці урадовую (або з урадавымі правамі) гімназію ды мае прынамся двухгадовую вучыцельскую практыку ў дзяржаўнай школе, 6) дэкларацыю якую дастане ў інспэктарапе Калі чаго небудзь з гэтых дакумантаў не хопіць, дык просьба разглядана ня будзе.

Прынятыя на курсы кандыдаты будуць узяты да працы, як практыканты, ад 1 красавіка 1927 г. — на варунках кантрактовых вучыцялёў.

Тэрмін пачатку навукі на курсах будзе абвешчаны міністэрствам асьветы.

З гэтага афіцыяльнага камуніката відаць, што колькіразовыя трэбаваньні Т-ва „Прасьвета" і пастановы зьезда Заходняй Беларусі 28 чэрвеня па школьнаму пытаньню нарэшце пачуты Варшавай і новым міністрам асьветы.

Аднак-жа Т-ва „Прасьвета" лічыць абавязкам падняць голас, каб папярэдзіць Пана Міністра Асьветы што нельга беларускія курсы, для беларускага настаўніцтва, для беларускіх школаў арганізаваць без удзелу беларускіх асьветных арганізацыяў.

Ня можна справу, якая мае вялікае значэньне ў жыцьці грамадзкім і палітычным поўнасцю перадаваць у тую інстытуцыю, якая як па свайму пэрсанальнаму складу, духу і прыкананьням далёка ад памаёвых настрояў. Друкаваная ніжэй заява аднаго з курсантаў б. настаўніцкіх курсаў п. Кацелло падыймае заслону над той атмасфэрой, якую вытварылі чыноўнікі віленскага кураторыума Гэтая атмасфэра вытварылася пасьля таго, як Т-ва „Прасьвета" была зусім адсунута ад ёю жа запачаткаваных курсаў. Адначасова Т-ва „Прасьвета" пратэстуе проціў не дапушчэньня на курсы кабетаў. Кабеты былі пакрыўджаны ў прошлым годзе і павінны быць дапушчаны на курсы ў гэтым годзе.

Роўным чынам Т-ва „Прасьвета" будзе дамагацца незабаўнага адчыненьня гэтых курсаў, а не з пачаткам школьнага году.

Дав дзячы аб гэтым да ведама грамадзянскай апініі Т-ва „Прасьвета" адначасна зварачваецца з адпаведным мэмарыялам да п. Міністра Асьветы.

Копія заявы да п. Кіраўніка Дадатковых Настаўніцкіх Курсаў для вучыцялёў пачатковых школаў — якія адбываліся у Вільні — б. слухача гэтых курсаў Яна Кацеллы.

Заява.

Пануючыя на курсах адносіны паміж Кіраўніком іх і слухачамі зьяўляюцца зусім немагчымымі для каждага шануючага свой гонар чалавека. Бо робяцца ня толькі сыстэматычныя зьдзекі над слухачамі, але п. Дырэктар дапускае нават абражаючыя нас назвы, як „bezmyślny pień" „dzik" „próżniak" і т. п. якімі тытулуе сваіх слухачоў. А побач з гэтым, ня кажучы аб зусім павярхоўным трактаваньні беларусазнаўства ў сыстэме навучаньня, так іважнага для будучых вучыцялёў беларускіх школаў — ня можа лічыць што і агульнае навучаньне знаходзіцца на патрэбнай вышыні. Перавышаючыя ўсякую меру вымаганьні, — ня могуць замяніць навукі.

Пры гэткіх варунках праўдападобнай навуковай здабычай могуць быць хіба толькі — кветкі выгавараў п. Дырэктара і высока — пэдагогічнае і культурнае трактаваньне слухачоў.

З прычыны вышэй паданага лічу сябе змушаным выпачыся высокага гонару ўважаюць сябе слухачом курсаў, хадзіць на лекцыі і быць аб'ектам начальніцкіх выпадаў п. Дырэктара.

Дзеля гэтага прашу звольніць мяне з курсаў з днём 1 лістападу і зьвярнуць мае дакуманты.

Ян Кацелло.

Вільня 29-X-25 г.

хаце скідаў кажухі, некаторыя-ж не распранаючыся засталіся ў чым ішлі, знаходзючы асалоду ў пякучым цяпле, якое іх ахапіла.

Хлапцы адышлі ўраз ў глыб хаты, цесна згуртаваўшыся ў куце за печкай, дзяўчаты-ж, пасядаўшы ўрад на ложках каля дзьвераў, выцягвалі з-за каптаноў пацеркі, ўстужкі, вязанкі грыбоў і цыбулі, або не кулькі абаранкаў, цукеркаў ці пернікаў.

Хлапцы таўкліся і тузаліся ў куце, сьмяючыся і пераваліваючыся на сваіх таўстых, цяжкіх ботах. Гаспадар хаты, атрымаўшы з рук „кавалераў" бутэлькі з гарэлкай, наліваў ім, сабе і дзяўчатам, якія адмаўляліся, адварачвалі галавы, але т-кі пілі па крысе, аддаючы адна аднэй кялішак з грубага шкла, сплёўваючы і абціраючы вусны канцамі хустак, якіх яны не паздымалі з галоў.

Урэшце, пасьля шаптаніны і нарадаў, піснула адна і другая бы флейта ці скрыпка, прабуючы свой струмант і пачалі яны, злучаючыся ў што раз то паўнейшы хор галасіць благім матам высака і тонка:

„Сядзіць, сядзіць Яшчар, Лада мая!
„На залатым крэсьле, Лада мая!
„У чырвонай адзежы, Лада мая!
„У гарохавым стозі, Лада мая!
„Гарошчак лушчыць, Лада!
„У каробачку сыпле, Лада!

Ажно заходзіліся яны ад гэтага пяяньня: адхіліўшы галовы і прыплюшчыўшы вочы і разьзявіўшыся, дзёрлі яны акуратна і не шкадуючы свае горлы.

Гаптам хлапцы кінуліся ў сярэдзіну, папіхаючы перад сабой нейкуюсь жудасную пачвару. Бо-ж ужо і выбралі хлапцы Яшчара! Ні каго іншага як кірносага Антука Пурлана! Хіба, мусіць, каб зрабіць на злосьць дзяўчатам, выбралі яны гэткую брыду: Твар васпаваты, разьзявяка, кудлы рыжаватыя, толькі вочы цёмныя і бліскучыя як ваўчыныя і зубішчы гэткія белыя, быццам ён сыр у роце трымае, — гэтак казалі аб ім дзяўчаты, згрудзіліся цясьней і піскаючы са сьмеху, набліжаючыся з удаваным страхам да Антука, каторы сядзеў ўжо на вальховым пяньку, сам бы тая калода, ў вывярнутым кажуху, у чырвонай на ім кашулі, падпіразанай паясом, і ў вянцу-кароне з ільсьнячай залацістай саломы, звісаючай ўкруг ягонага дзікага твару, быццам нейкія спруцянелыя ад чараў валосься.

Тут дзяўчаты жаласьліва загаласілі:

„Лада, Лада мая!
„Яшчар паночак,
„Аддай мой вяночак!
„Край мора схадзіла,
„Ручкі ножкі ззябіла,
„Пакуль вянец зрабіла!
„Мая матка ліхая,
„Няма вянца, пытае!"

Хата ажно дрыжэла ад вераску і ляманту.

(Канец будзе).

З польскае мовы пераклаў

Я. Сьветазар.

Вільня, Люты 1927 г.

Сельсаюз і віленскія польскія дэмакраты.

Апошнія часы орган віленскіх дэмакратаў „Kurjer Wileński" пылае вясеньнім каханьнем да Сельсаюзу.

Амаль ня ў кожным нумары „Kur W." рэклямуе гэтую арганізацыю, якую на двух канфэрэнцыях Навагрудзкай і Горадзенскай ані водны з дэлегатаў на месцах абсалютна не сканстатаваў нават ані воднага гуртка ці камітэту, ці сэкрэтарыяту Сельсаюзу: усё апынілася ў руках Грамады! Але відаць прыбліжэньне вясны гэтак падзеяла на п.п. дэмакратаў, што яны ў захопленьні раньнім каханьнем гэтак размахнуліся, што пачалі ўжо на старонках свайго органу пісаць ад імя Сельсаюзу, што той гатоў (сяньня, як ня гэтак даўно! Рэд.) „ісьці на паразуменьне з польскім урадам. На што адкінуты ў сваім часе каханак заявіў: „на падставе якіх фактаў аўтар таго артыкулу зрабіў вывад, што Сялянскі Саюз склоньны да паразуменьня з польскім урадам?!"

З чым „Kurjer Wileński" і віншуем. Ад сабе дабавім, што да гэтых часоў усе віленчукі лічылі „Kurjer Wileński" органам па крайней меры блізкім да Маршалка Пілсудскага.

Дык як зьвязаць гэтае ўпартае рэкляманьне пустога мейсца — Сельсаюзу з... ну хаця бы перад апошняй прамовай лідэра Сельсаюзу пасла Рагулі, які апрача іншых кветак сваей буйнай антыурадавай дэмагогіі, проста дапусьціўся няпрыстойных выпадаў проціў самое асобы Маршалка Пілсудскага, у насьмешлівай форме з трыбуны, называючы апошняга „дзядкам"?

Чытайце і пашырайце „Беларускае Слова.

Кітайскі Чычэрын.



Чэн — міністар заграгічных справаў Кантонскага ўраду.

У С. С. Р. Р.

Арышты каталіцкага духавенства.

Савецкая ўлада распачала барацьбу ня толькі з праваслаўным духавенствам — але і з каталіцкім. Аб арышце галавы праваслаўнае царквы ў Расеі — мітрапаліта Сяргея, мы падалі ў прошлым нумары. Цяпер надыйшла вестка аб арыштах каталіцкіх ксяндзоў.

У Петраградзе арыштавана і пасаджана ў вастрог 6 ксяндзоў. Роўным чынам 12 сясьцёр францішканак. Зроблены вобыскі ўва ўсіх каталіцкіх касьцёлах у Петраградзе і Царскім Сяле.

З Жытомірскай і Магілёўскай епархій выслана на Салавецкія вастравы 6 ксяндзоў.

Згінуў камандзір Пскоўскіх паўстанцаў.

У Лепельскім раёне ў баю паміж паўстанцамі і часьцямі Г.П.У. забіты палкоўнік Васін, камандзір апошняга пскоўскага паўстаньня.

Гэтага ня можна...

Нядаўна старшыня міжнароднага Чырвонага Крыжа у Жэнэве Адор, зьвярнуўся да Чычэрына з просьбай дазволіць дэлегацыі Чырвонага Крыжа паехаць і зайсьці да концэнтрацыйнага лагэру палітычных вязьняў на Салавецкіх вастравах. У сваёй просьбе Адор указаў, што ні адзін эўрапэйскі ўрад не адмаўляў яму ў падобнай просьбе.

Аднак Адор атрымаў адмоўны адказ.

Бунты сярод чырвонаармейцаў.

Да Масквы дайшлі старанна хаваныя савецкай уладай весткі аб вялікіх непарадках, якія нядаўна здарыліся ў вайсках Чыцінскага гарнізону, частка якіх была перакінута на кітайскую граніцу.

Непарадкі жорстка падаўлены. Расстраляна некалькі камандзіраў і чырвонаармецаў.

Тутэйшая хроніка.

Сьмерць доктара Басановіча. 16 лютага памёр у Вільні вядомы літоўскі дзеяч доктар Басановіч. Літвіны лічаць Басановіча патрыярхам свайго адраджэньня.

З прычыны ягонае сьмерці ў Літве абвешчана пяцідзённая жалоба.

Хаваць доктара Басановіча прыбыла з Літвы спэцыяльная дэлегацыя, якая складалася з культурных дзеячоў і пасолоў Ковенскага Сойму.

Суд над зіц-рэдактарам грамадаўскай „Беларускай Справы“. 21 лютага Акружны Суд у Вільні разглядаў справу зіц-рэдактара „Беларускай Справы“ Сымона Макуліка. Прыгавораны Макулік на 2 з паловай гады крэпасьці.

Гарэлка патанее. Сьпіртная манаполія приступае да арганізаваньня ўласных разьлеўняў гарэлкі дзякуючы чаму гарэлка будзе каштаваць значна танней.

Зьніжэньне аплаты за заграні̇чны пашпарт. Міністэрства фінансаў разглядае пытаньне аб зьмяншэньні аплат за заграні̇чны пашпарт да 150 зл. Адпаведнае распараджэньне будзе апублікавана каля 15 сакавіка.

Арышт старшыні Вялейскага камітэту Грамады. Некалькі дзён таму назад быў арыштаваны і пасаджаны ў вастрог старшыня Вялейскага камітэту Грамады Антановіч. Арыштаваны належаў да Комуністычнае Партыі Заходняй Беларусі і быў савецкім шпіёнам.

Арыштаваны ня раз нелегальна езьдзіў да Менску і атрымліваў там інструкцыі для К. П. З. Б і Грамады.

Батал'я ў рэдакцыі „Нашага Голасу“. 24 лютага зьявіўся ў рэдакцыі грамадаўскага „Нашага Голасу“ — эсэр Мамонька.

Мамонька патрэбаваў ад рэдактара „Н. Голасу“ доказу аб ягоным — Мамонькавым нібы-та супрацоўніцтве з дэфэнзывай, аб чым пісаў „Н. Голас“. Калі-ж рэдактар „Н. Голасу“ гэтага не зрабіў, — Мамонька схапіў крэсла і запусьціў у яго, ранючы ў галаву.

Аб усім гэтым піша „Віленское Утро“.

Ад сябе мы бы раілі сацыялісту — рэвалюцыянэру апэраваць больш рэвалюцыйнымі прадметамі, як нпр. аглобля і г. д., бо толькі такімі прадметамі можна праканаць таўстаскурых грамадаўцаў.

А па другое раілі-б свой рэвалюцыйны імпэт скіраваць не на бязьлікіх зіц-рэдактараў, а на фактычнага рэдактара п. Сьмярдзякова.

Арышт шпіёнаў. 23 лютага ў Язьненскай гміне Дзісьненскага павету арыштаваны і абвінавачаны ў шпіёнстве на карысьць С. С. Р. Р. — Мятла Павал (старшыня гуртка Грамады), Шаня Базыль (сэкрэтар гуртка) і яшчэ некалькі асобаў.

Суд над бандытамі. Нядаўна „даразны“ суд разглядаў справу некалькіх бандытаў, напаўшых і забіўшых з мэтай рабунку нейкага Камароўскага.

Двух з бандытаў Суд прыгаварыў на кару сьмерці. Аднак Прэзыдэнт Рэспублікі аднаго памілаваў.

Такім чынам быў расстраляны адзін падсудны — Бараноўскі.

Непарадкі у Слоніме.

(ад уласнага карэспандэнта)

17 лютага на Слонімскім рынку, зьявілася некалькі падазроных суб'ектаў, якія паднялі на дручках два чырвоныя штандары з надпісамі: Няхай жыве Савецкая Беларусь, Няхай жыве К. П. З. Б. і іншымі. Каля іх сабралася таўпа. Пачаліся крыкі: „Ура“ і інш.

Аднак на месцы аказаліся і працоўнікі комуністаў, якія пачалі сьвістаць; пачуліся крыкі — далоў комуну! Магчыма, што распачалася-бы бойка, але ў час прыбыўшая паліцыя разагнала натоўп. Некаторыя з дэманстрантаў бараніліся і такім чынам паліцыя пусьціла ў ход аружжа, прычым былі раненны 2 асобы.

Арыштавана каля 30 чалавек. Усё комсамольцы па 20—25 гадоў.

Слонімская хроніка.

Ўсьлед за Пшэцішэўскім, слонімскім старастай, пайшоў у адстаўку Наакоўскі, „zastępca“ і... страх усіх пісарчукоў гмінных — інспэктар самаўрадаў Слонімшчыны

Дзякаваць Богу, што маёвая санацыя трапіла да Слоніма і пачала цяпер ачышчаць гэтую „камарылю“... Паветра стала ачышчацца наканец... Чакаем далей на рэзультаты!

Сяляне некаторых вёсак скардзяцца, што войты бяруць ад іх за „pozwolenie“ на будову хат, чы інш. будынкаў па 2 зал., а былі выпадкі што і па 4 зл. Гэта ёсьць простая самаволя войтаў, калі мець на ўвазе „Ustawę z 18 VII 24 r. w sprawie zmiany niektórych przepis. budowlanych“.

Паводле гэтай уставы „pozwolenia“ на будовы новых, чы перабудову старых будынкаў, старшыня гміны дае безплатна Калі старшыня захоча аплаты, трэба даць і з квітком на аплачаную суму грошаў зьвярнуцца зараз-жа асабіста да пав. старшыні са скаргай.

Сыман Жытковіч з в В.-Кракотка, Слонімск. пав., ведамы комуністычны дзеяч у Езёрніцкім раёне, б. настаўнік, які быў на кракаўскіх вучыц. курсах цяпер з прычыны сваей комуністычнай „працы“ сярод спакойнага насяленьня, згубіў вучыцельскую пасаду і школьная улада выдала загад, каб Жытковіча не прыняць нават у прыватныя школы.

Гэты чырвоны таварыш мае ўцякаць да Менска. Туды дарога, таварыш Сымон! Тутака комуністычнай заразы ня трэба!

Чы ведаюць людзі аб тым, што б. „істінна — савецкій“, школьны інспэктар на Слонімскі павет — у 1919 г. п. Г. з в. Рахавічы, Жыравіцкае гм., бярэ цяпер каля 350 зал. у месяц пэнсыі як настаўнік польскі і памагае гуртkоўцам!! Раней, у 1920 г, савецкі камісар ў м. Слоніме — бярэ добрую пэнсію, цяпер цягне ад палякоў, памагае гурткоўцам, — адным словам: „працуе“..

Пане Г!. Радзім, кіньце займацца грамадаўскай палітыкай, а лепей глядзіце школы!

Восеньню 1924 г. палітычныя вязьні Слонімскай турмы пры актыўнай помачы „dozorcy więzienia“ А. Курылло зрабілі спробу ўцячы. Курылло зачыніў „cel dozorców“, а стаячаму пры варотах сілаю адабраў стрэльбу. Нешта пашкодзіла ўцякаючым і ўсё не ўдалося. 16. II. 27 г. Акр. Суд ў Горадні, на судовай сэсыі ў Слоніме, засудзіў „pana dozorcę“ А. Курылло за тое, што будучы чыноўнікам, якому была даверана апека над вязьнямі, актыўна памагаў уцякаць вязьням, — на 5 гадоў цяжкай турмы.

Бальшавікі даўно расстрэлялі бы такога служачага турмы.

17 II. 17. Акружн Суд ў Слоніме засудзіў за комуністычную дзейнасьць нейкага Тарасюка на 5 гадоў ц. турмы.

У той-жа справе 7 чалавек зволнена ад кары.

„Фабрыкант“ гурткоў і вельмі важная пэрсона ў Цэнтр. Сэкр. „Грамады“ ў Вільні — нейкая комуністычная пошкудзь — Нікон Кічан — прыехаў ў Міжэвічы.

Гэты таварыш быў на агітатарскіх курсах „Грамады“ ў Радашковічах.

Цяпер, як кажуць жыхары, прыехаў сюды ў „спэцыяльнай місыі“(?)...

Добра ведаем гэтыя „місыі“... Шкада працы! Чырвоная банда комуністычных шулераў апошнюю стаўку ўжо прайграла...

Цікава ведаць колькі чырвонцаў у Вільні асыгнавалі на „спэц. місію“ тов. Кічану?!

Ад адміністрацыі.

Нашая газэта, пачынаючы ад лютага месяца будзе выходзіць акуратна раз у тыдзень у павялічаным разьмеры і з ілюстрацыямі.

Дзеля гэтага яшчэ раз прапануем усім падпішчыкам, не прыслаўшым дагэтуль падпіскі, паруціцца з прысылкай яе.

Падпісная плата на 3 месяцы выносіць заместа 3 зл., як раней, толькі 2 злотых.

Адміністрацыя.

АДОЗВА

Да Беларускага Грамадзянства Горадзеншчыны.

Дзеля палепшаньня жыцьця нашых беларусаў, патрэба пакіраваць іх дзейнасьць і імкненьні на верны і правідловы шлях і дзеля гэнага на зьездзе Заходняй Беларусі ў Вільні ў чэрвені мінулага 1926 году, выбрана Беларуская Нацыянальная Рада.

Беларуская Нацыянальная Рада мусіць паказаць верны і правідловы шлях у яго дзейнасьці і імкненьнях, як палітычных, так і культурна-прасьветных, а таксама і гаспадарчых патрэбаў, як роўнапраўных грамадзян Польскай Рэспублікі. Дзеля працы сваей Бел. Нац. Рада прыймае за падставу Конституцыю Польскай Рэспублікі, каторая дае шырокія правы ў ім народам, населяючым тэрыторыю Польскае Рэспублікі на роўні з насяленьнем польскім.

Прыймаючы пад увагу Польскую Канстытуцыю, Бел. Нац. Рада стаіць на грунце права і паводле чаго у сваіх жаданьняў ідзе па законнаму шляху.

Бел. Нац. Рады стаіць у абароне беларусаў, каторыя ўжо сталі прыхільна адзывацца з розных куткоў Заходняй Беларусі і запісывацца да гэнае арганізацыі.

Цэнтральны Урад Бел. Нац. Рады знаходзіцца ў Вільні, сэкрэтарыяты адчынены па ўсіх Вакругах Заходняй Беларусі, апрача таго, усюды на гарадох, мястэчках і вёсках адкрываюцца цяперака гурткі Бел. Нац. Рады, каб гэным самым даць магчымасьць насяленьню заяўляць аб сваіх патрэбах і каб хутчэй дабіцца іх спаўненьня ад Улады,

Сэкрэтарыят Бел. Нац. Рады адчынены ўжо ў Горадні і зьмешчаецца на вуліцы Ажашковай пад Nr 8. У прэзыдыум гэнага сэкрэтарыяту ўвайшлі ўсім вядомыя беларусы, каторыя як патрыёты беларускія імкнуцца вызваліць беларусаў сялян ад іх нядолі.

Заданьнем гэнага сэкрэтарыяту ёсьць-жа наступнае:

1. Адчыненьне вясковых школ з выкладоваю моваю беларускаю, адчыненьне коопэратываў, бібліятэк і г. д.
2. Адчыненьне праваслаўных зачыненых цэркваў і дабівацца, каб гаварыліся ў іх казаньні ў нашай мове
3. Дабіцца, каб насяленьне атрымала лес на адбудову, каб у першую чароу ад парцэляваных маёнткаў, зямлю атрымлівала мясцовае беларускае насяленьне і г. д.

Дык, грамадзяне беларусэ!. за Вамі толькі астаноўка, арганізуйцеся у адну магутную арганізацыю пад нацыянальным Вашым сьцягам Бел. Нац. Рады, заяўляйце ўсе Вашы патрэбы да Горадзенскага Акружнага Сэкрэтарыяту Бел. Нац. Рады праз выбарных Вашых даверанных людзей. Тутака Вы знойдзеце сабе параду аб усіх Вашых балячках і ўсё тое, што ня выходзіць з рамак законнасьці, права і справядлівасьці. Будзьце пэўны, што пры дапамозе Бел. Нац. Рады Вы ўсё гэнае атрымаеце.

Папераджаем Вас у тым яшчэ раз і просім Вас ня верыць брахунам іншых арганізацыяў, каторыя можа нават будуць і падбухторываць Вас на розныя комбінацыі, абяцаючы Вам залатыя горы, а канец з канцамі ніколі нічога Вам не дадуць, а толькі выкарыстаюць з Вас свае асабістыя выгады і давядуць Вас да няшчасьця.

Дык у добры час прымемся да працы на карысьць нашай дарагой Бацькаўшчыны!

Горадзенскі Акружны Камітэт
Беларускай Нацыянальнай Рады.

Горадня, 25 лютага 1927 г.

Адрэс Сэкрэтарыяту:
м. ГОРАДНЯ, вул. Ажашковай дом Nr 8.

Усячына.

ФЭНОМЭН.

Савецкая прэса падае аб фэномэне, які паявіўся ў Ташкенце. Гэта нейкі Назараў, які паступіў да ташкенцкага ўнівэрсытэту ў 1919 годзе, калі яму было 10 гадоў. Курс сярэдняй школы ён прайшоў у працягу 1 году. Першы курс матэматычнага факультэту на які яго прынялі ўмоўна, ён прайшоў гэтак добра, што маючы 11 гадоў быў пераведзены на другі курс. У гэтым годзе ён скончыў унівэрсытэт і напісаў значную навуковую працу.

Цяпер ён вызначаны прафэсарам ташкенцкага ўнівэрсытэту.

ШТО ВАРТА ЧАЛАВЕЧАЕ ЦЕЛА.

Адзін прафэсар у Амэрыцы падлічыў, што можна зрабіць з той матэрыі, з якой складаецца чалавечае цела. Вось-жа ён вырахаваў гэтак: У арганізме сярэдняга чалавека, які важыць 75 кілё — знаходзіцца гэткая матэрыя для практычнага ўжытку: тлустасьці ўсяго столькі, што з яе можна зрабіць тры сьвечкі; вады хапіла бы толькі на тое — каб выпраць тры прасьціradла; з жалеза, што знаходзіцца ў людзкім целе, можна зрабіць адзін цьвек даўжынёй як малы палец; серкі, што распушчана ўсюды па целе чалавека, можна струціць толькі скочак (блох) на адным сабацы: цукру ёсьць столькі, што хапіла бы на адну шклянку гарбаты.

Амэрыканскі прафэсар аблічае — колькі каштуюць усе гэтыя матэрыялы і сьцьвярджае, што яны каштуюць 98 амэрыканскіх цэнтаў — 8 зл. 80 гр.

Ходзяць чуткі.

...што ў радашкоўскім інтэрнаце аб'явіўся 9-ты цуд прыроды — 10-х гадовы мэтадыстаўскі прарок і цудатворца...

...што Луцкевіч прыслаў да рэдакцыі „Сел. Нівы“ пратэст, што „Мопр“ гэта не „міжнароднае обшчэства прапаганды“, як падала палітычна — граматная „Сялянская Ніва“ № 17, а ёсьць „міжнародным обшчэствам *помачы рэвалюцыянэрам*“...

...што Макар зноў зьменавіхнуўся і кінуўшы усіх сваіх грамадаўскіх і сельскіх цялятак і каровак і „за прылічнейшае вознаграждені̇е“ апынуўся ў ціхай спакойнай прыстані...

...што ўдзячны абаронца грамадаўцаў п. Сьвячевіч прыслаў да Луцкевіча падзяку за комплімэнты і па памылцы падпісаўся сваім псэўданімам „Бор...

...што Хопала — Вашэйла склікаў у Горадні аграмадную канфэрэнцыю, на якую зьявіліся: Хапайла, Вашэйла і Лапцюрка — разам трох. — Канфэрэнцыя адбылася ў паліцэйскім вучастку...

...што грамадаўцы пастанавілі расстрэляць усіх сябраў і прыхільнікаў Рады .з гарматаў...

Паштовая скрынка.

Беніцкаму — з прысланага скарыстаем. Але іншым разам пішыце чарнілам і на адным баку паперы.

Белуш Янка, Патыш Антон, Пазьняк Макэр, Саўчыц Базыль, Ломчык Кузьма, Хруцкі Міхал, Самахвал Янка, Перадзельскі, Лішык Тодар, Катрач Вера, Мукасей Аркадзь, Чырвоны Уладзімер, Лазоўскі Аляксандр, Чычко Тарас — „Беларускае Слова“ высылаем.

Жаўрыд Язэп, Гурэцкі Аляксей, Астапкевіч Іван, Тур Павал, Смаленскі Мікола, Лукша Пётра, Руновіч Грыгор, Пабаш Янка, Калодка Клеман, Філістовіч Янка, Сакалоўскі Нікіта, Іванкевіч Кастусь — пробныя нумары „Беларускага Слова“ высылаем.

Харытанюк у Слоніме — патрэбны нумар дасылаем.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Пасьпешная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.